В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

## Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Часціца як часціна мовы

**Часціца** — нязменная часціна мовы, якая надае словам, словазлучэнням ці сказам сэнсавыя ці эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні або служыць для ўтварэння формаў слоў (ладоў дзеяслова).

Часціцы не маюць самастойнага лексічнага значэння. Іх значэннем лічыцца тое дадатковае адценне (указальнае, узмацняльнае, пытальнае і інш.), якое яны надаюць словам, словазлучэнням ці сказам.

Часціцы не з'яўляюцца членамі сказа

# Разрады часціц

Разрады часціц вылучаюцца з улікам іх паходжання, будовы (структуры) і значэння.

**1. Паводле паходжання**

- **невытворныя:** не суадносяцца ў сучаснай мове з іншымі часцінамі мовы: а, і, вось, жа (ж), не
- **вытворныя:** паходзяць ад займеннікаў: яно, гэта, усё; прыслоўяў: так, ужо, куды; дзеясловаў: дай, няхай, бач; выклічнікаў: ну, ох

**2. Паводле структуры**

- **простыя:** г. зн. аднаслоўныя: аж, але, якраз, хіба, не, так
- **састаўныя:** з некалькіх слоў: вось дык, хоць бы, куды там, ну і

**3. Паводле значэння**

- сэнсавыя
- мадальныя
- эмацыянальныя
- формаўтваральныя



© ТДА «Аверсэв»

## Сэнсавыя часціцы

| Групы | Часціцы | Значэнне |
|---|---|---|
| Указальныя | вось, вунь, гэта | указваюць на наяўнасць прадметаў і з'яў: Вунь там мы ўбачылі лісу. |
| Удакладняльныя | акурат, іменна, амаль, якраз, чыста | удакладняюць сэнс слоў, перад якімі стаяць, надаюць ім тую ці іншую якасную ці азначальную характарыстыку: Іменна Міхась забіў першы гол. |
| Абмежавальныя | толькі, хоць бы, хіба толькі | выдзяляюць у выказванні пэўныя паняцці і надаюць абмежавальнае адценне: Хлопчыку хацелася хоць бы ў кіно пайсці. |

## Мадальныя часціцы

| Групы | Часціцы | Значэнне |
|---|---|---|
| Сцвярджальныя | ага, але, так | абазначаюць станоўчы адказ, пацвярджаюць думку: Так, гэта было вясной. |
| Адмоўныя | не, ні, ані | адмаўляюць дзеянні, прадметы, з'явы: Ні дрэўца каля той хаты. |
| Пытальныя | ці, хіба, так, няўжо, а | ужываюцца для выражэння пытання: Няўжо гэта брат прыехаў? |
| Пабуджальныя | ану, дай, ну, няхай (хай) | выражаюць пабуджэнне да дзеяння, просьбу, пажаданне: Ну, будзем знаёміцца. |
| Параўнальныя | як, бы, быццам, быццам бы, нібы | ужываюцца пры параўнанні з'яў, выражаюць меркаванне, верагоднасць: Неба як бы пасвятлела. |



© ТДА «Аверсэв»

## Эмацыянальныя часціцы

| Групы | Часціцы | Значэнне |
|---|---|---|
| Узмацняльныя | аж, ажно, нават, ж (жа) | узмацняюць сэнс моўнай адзінкі, да якой адносяцца: А яна ж аб ім гадала. |
| Клічныя | вось дык, як, бач, калі б, ну і (ну й) | выражаюць эмацыянальную ацэнку выказвання — радасць, захапленне і да т. п.: Мой родны кут, як ты мне мілы! (Я. Колас). |

## Формаўтваральныя часціцы

| Служаць для ўтварэння формаў дзеяслова | | | |
|---|---|---|---|
| умоўнага ладу | | загаднага ладу | |
| бы | павіншаваў бы<br>падараваў бы | няхай (хай) | няхай цвіце<br>хай расце |
| б | павіншавала б<br>падарожнічала б | давай (давайце) | давай абмяркуем<br>давайце абмяркуем |

## Значэнне часціцы НЕ

| Часціца НЕ выражае | |
|---|---|
| адмоўны сэнс | сцвярджальны сэнс |
| 1) сказа: Сосен ты такіх не бачыў, дружа любы;<br>2) слова пры супрацьпастаўленні: Не свяціла — жэгла сонца (Я. Колас);<br>3) пры адмоўным параўнанні: Ой, не хмара градавая ў полі ніўку косіць, — секвестратар за падаткі нечы пот выносіць (С. Крывец); | 1) калі ўжываецца двойчы пры кожнай частцы састаўнога выказніка: Я не мог не пайсці на сустрэчу з касманаўтам;<br>2) калі стаіць перад назоўнікам з прыназоўнікам без: наведаў не без карысці;<br>3) у рытарычных пытаннях, рытарычных клічных сказах: Як не любіць свой край? |



© ТДА «Аверсэв»

| Часціца НЕ выражае | |
|---|---|
| **адмоўны сэнс** | **сцвярджальны сэнс** |
| 4) пры адмоўным адказе на станоўчае пытанне: «Вы ведаеце верш на памяць?» — «Не». | 4) калі спалучаецца з часціцамі амаль, ледзь, чуць, злучнікамі каб, пакуль, словамі нельга, немагчыма: ледзь не забыў, каб не бачыў, нельга не заўважыць;<br>5) у спалучэннях дзе не, дзе толькі не, куды не, хто не і да т. п. |

## Значэнне часціцы НІ

| Значэнне | Прыклад |
|---|---|
| 1) адмоўнае значэнне ў пабуджальных сказах; | Нікому ні слова! (К. Чорны). |
| 2) поўнае адмаўленне ў безасабовых сказах з дапаўненнем у форме роднага склону; | На небе ні яснінкі, ні прасветлінкі. |
| 3) узмацняе адмоўны сэнс сказа з часціцай не, словамі нельга, няма; | Вакол не відаць ні кусціка. Няма ні граша. |
| 4) узмацняе сцвярджальны сэнс сказа ў спалучэнні з займеннікамі і прыслоўямі тыпу хто ні, хто б ні, што б ні, дзе ні, як ні, куды б ні і да т. п. | Усюды я бачу прыветлівыя твары людзей, дзе ні бываю. |

## Правапіс часціц

| Часціца | Напісанне |
|---|---|
| бы (б)<br>жа (ж) | **асобна:**<br>а) пасля слоў на зычны — бы, жа: сустрэў бы брата; сустракай жа брата;<br>б) пасля слоў на галосны — б, ж: сустрэла б брата; сустрэла ж брата |



© ТДА «Аверсэв»

| Часціца | Напісанне |
|---|---|
| абы | **праз злучок:**<br>з займеннікамі і прыслоўямі: абы-хто, абы-нешта, абы-калі, абы-як;<br>**асобна:**<br>а) калі пры займенніку ёсць прыназоўнік: абы ў каго, абы з чым;<br>б) з іншымі часцінамі мовы: абы зіма, абы дзешавей, абы чысты, абы двое |
| такі | **праз злучок:**<br>а) калі стаіць пасля дзеяслова: прачытаў-такі;<br>б) у словах даволі-такі, зноў-такі, усё-такі, так-такі;<br>**асобна:**<br>а) калі стаіць перад словамі, да якіх адносіцца: такі выканаў заданне, такі ўсе сабраліся, такі многа ў лесе ягад;<br>б) калі паміж словамі усё і такі ўжываецца часціца ж, то ўсе яны пішуцца асобна: усё ж такі наша каманда выйграла |
| Правапіс не (ня), ні з асобнымі часцінамі мовы разглядаецца ў адпаведных раздзелах | |

# Марфалагічны разбор часціцы

## Парадак разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Марфалагічныя прыметы: нязменнае слова; разрад паводле паходжання, разрад паводле структуры, разрад паводле значэння.
3. Сінтаксічная роля (для формаўтваральных).

## Узор разбору

Лес тым часам нібы расступіўся, і неяк адразу пасвятлела (А. Асіпенка).

*Нібы* — часціца, мае параўнальнае значэнне, нязменнае слова, вытворная, простая, мадальная.

Не з'яўляецца членам сказа.



© ТДА «Аверсэв»